УДК 811.161.3

ЛЕКСІКА-СЕМАНТЫЧНЫЯ ГРУПЫ ЎСТАРЭЛАЙ ЛЕКСІКІ І ІХ СТЫЛІСТЫЧНЫЯ ФУНКЦЫІ Ў МАСТАЦКІХ ТЭКСТАХ УЛ. КАРАТКЕВІЧА

Ячмянёва Ірына Мікалаеўна
дацэнт кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства ўстановы адукацыі
“Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова”;
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
(г. Магілёў, Беларусь)
kaf_osy@msu.by
Борбат Таццяна Іванаўна
загадчык кафедры літаратуры і міжкультурных камунікацый установы
адукацыі “Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова”;
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
(г. Магілёў, Беларусь)
borbat_ti@msu.by

Артыкул прысвечаны даследаванню ўстарэлай лексікі ў мове твораў У. Караткевіча, стваральніка высакаякаснай гістарычнай прозы, дзе пісьменнік узняў шырокія пласты нацыянальнай гісторыі, выявіў буйныя характары, здолеў раскрыць багаты духоўны свет сваіх герояў і звязаць іх асабісты лёс з лёсам народным.

Безумоўна, развіццё мовы непарыўна звязана з жыццём і развіццём грамадства. І таму хуткасць грамадска-палітычных і культурна-гістарычных працэсаў уплывае на хуткасць перамяшчэння слоў з актыўнага складу ў пасіўны і наадварот.

У залежнасці ад таго, якія кампаненты ў структуры слова ўстарэлі, сярод архаізмаў вылучаюцца наступныя групы: уласна лексічныя – словы, якія поўнасцю ўстарэлі (напр., *вакацыі, лемантар*); лексіка-словаўтваральныя – устарэлыя словы, якія адрозніваюцца ад сучасных актыўных адпаведнікаў пэўным словаўтваральным элементам (напр., *лётнік, перакупка*); лексіка-фанетычныя – словы, якія адрозніваюцца ад

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

сучасных актыўных адпаведнікаў вымаўленнем аднаго ці некалькіх гукаў (напр., *філёзофія, філёлёгія*); лексіка-семантычныя – словы, у якіх устарэла не форма, а змест (значэнне) (напр., слова *скарбніца* ў значэнні ‘месца захоўвання каштоўных рэчаў‘ устарэла, але захавалася ў іншых значэннях ‘матэрыяльныя каштоўнасці, маёмасць, багацце‘ і ‘месца сканцэнтравання якіх-небудзь каштоўнасцей‘; слова *ясны* ўстарэла толькі ў значэнні ‘знатны, вяльможны, багаты’, у іншых значэннях захавалася).

У сучасных мастацкіх творах устарэлыя словы (гістарызмы і архаізмы) ужываюцца з пэўнай стылістычнай мэтай (іх часам называюць гістарызмамі і архаізмамі стылістычнага ўжывання). Стылізацыі – гэта калі аўтар прыбягае да стылізацыі гістарычных твораў, г. зн. да іх апрацоўкі дзеля таго, каб чытач разумеў гэтыя творы.

У мастацкіх творах на гістарычныя тэмы такая лексіка выконвае ўжо намінатыўна-стылістычную функцыю – не толькі пазначае рэаліі, але і стварае пэўны каларыт эпохі. Устарэлыя словы могуць выкарыстоўвацца ў мастацкім тэксце для ўказання на час, у які адбываецца дзеянне.

Устарэлыя слова (пераважна архаізмы) могуць выконваць і ўласна стылістычныя функцыі. У мастацкіх творах пісьменнікі паказваюць розныя гістарычныя эпохі. Героямі могуць быць прадстаўнікі розных класаў і сацыяльных груп. Дзеянне можа разгортвацца ў самых розных месцах. Таму для рэалістычнага прайгравання рэальнасці, для таго, каб адлюстраваць падзеі як мага бліжэй да праўды, выклікаць у чытача больш дакладныя ўяўленні аб пэўнай гістарычнай эпосе пісьменнікі звяртаюцца да ўстарэлай, дыялектнай, спецыяльнай і нават жаргоннай лексіцы [1, с. 83].

Устарэлыя словы ў мастацкіх тэкстах У. Караткевіча выконваюць некалькі стылістычных функцый: намінатыўную, мастацка- выяўленчую, функцыю гумару і сатыры і функцыю стылізацыі. Усе яны ўжыты для таго, каб адлюстраваць спецыфічныя асаблівасці мінулых падзей, а таксама ў якасці стылістычных сродкаў для стварэння ўрачыстасці, ўзнёсласці ці іроніі і гумару, у пераносным сэнсе ў якасці параўнання.

Разгледзім пэўныя лексіка-семантычныя групы ўстарэлых слоў у тэкстах пісьменніка.

1. Назвы адзення і зброі:

кій – баявы молат. “<…> Стаялі, абапіраючыся на кіі <…>” [2, с. 43]; *нагавіцы* – адна з асноўныйх частак традыцыйнага мужыцкага адзення беларусаў; штаны. “<…>. Пасля купання яны апрануліся ў суседнім пакоі, і гэта было вельмі падобна на маскарад, бо абодва апранулі ўзверх батыставых сарочак з куранкавай грудзінай і вузкіх нагавіц да калень яшчэ і шырокае

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

мясцовае адзенне <…>” [2, с. 66]; *чуга* – від старадаўняга адзення; кафтан. “<…> Бацька ўсклаў на сябе суконны паднізень вішнёвага колеру, а паўзверх яго чырвоную, тканую золатам чугу, крэхчучы, нацягнуў малінавыя боты і чырвоныя замшавыя пальчаткі <…>” [2, с. 38]; *кальчуга* – даўнейшы воінскі даспех у выглядзе рубашкі з металічных кольцаў. “…На сценах віселі старыя чаканы, двухручныя мячы, кальчугі <…>” [2, с. 189]; *сярмягі* – від верхняга адзення з даматканага сукна. Буклі – завітыя кольцамі валасы; локаны. “<…> На сівых буклях непрыступна ўзвышаўся беласнежны высокі чапец <…>” [2, с. 169]; *чапец* – лёгкі галаўны ўбор у выглядзе шапкі, які раней насілі замужнія жанчыны. “<…> На сівых буклях непрыступна ўзвышаўся беласнежны высокі чапец <…>” [2, с. 18]; *мантылья* – кароткая жаночая накідка без рукавоў. “<…> Але яна стрымалася і знешне спакойна паправіла на плячах доўгую карункавую мантылью <…>” [2, с. 89]; *фібула* – металічная засцежка для верхняй адзежы ў выглядзе брошкі, якая ўжывалася ў старажытных народаў Еўропы, Азіі і Афрыкі. “<…> Пасля, замест паднізня, бацька накінуў на яго шырокую белую кашулю з адным плячом, – на другім яе закалолі сярэбранай фібулай <…>” [2, с. 100]; *чакан* – старажытная зброя ў выглядзе насаджанага на доўгае дзяржанне солата, што служыла таксама знакам начальніцкай годнасці. “<…> На сценах віселі старыя чаканы, двухручныя мячы, кальчугі <...>”. [2, с. 34]; *чаравікі* – невысокі, да шчыкалаткі і крыху вышэй, скураны абутак на шнурках. “<…> Мужчына ў чашучовай тройцы,чаравіках і шыракаполым саламяным брылі <…>” [2, с. 56]; *раброны* – старадаўняя жаночая сукенка з крыналінам. “<...> На Украіне секлі галовы, жанчынам рэзалі раброны <...>” [2, с. 18]; *мушкет* [ст.-бел. мушкетъ; фр. mousgnet] м. – старажытная буйнакаліберная ружжо з кнотам для запальвання пораху, якое знаходзілася на ўзбраенні пяхоты ў краінах Еўропы ў 16-17 стст. [3, с. 343]. “<...> У іх было мала мушкетаў <...>” [2, с. 45]; *латы* [ст.-бел. латы] мн. – металічныя даспехі, якія ў старажытнасці засцярагалі воіна ад удараў халоднай зброі, а ў сярэднія вякі – і ад агнястрэльнай зброі [3, с. 292]; *рацішчы* н. тое, што рагаціна – зброя ў выглядзе кап’я, насаджанага на кароткае дрэўка [3, с. 444] “<...> Дзіды, уторкнутыя ў зямлю, рацішчы, адагнутыя ў шыйцы косы <...>” [3, с. 39]; *руніца* [ст.-руск. Ргчьница; польск. rusznica] ж. – адзін з першых узораў ручной агнястрэльнай зброі ў краінах Усходняй і Цэнтральнай Еўропы [3, с. 449]. “<...> Стрэльбу ўсякую, то – бок гакаўніцы, ручніцы <...>” [2, с. 28]; *тэрфін* – тонкае, вельмі дарагое сукно [3, с. 578]. “<...> А за насатым яшчэ і яшчэ коннікі, у парчы, сабалях, у тэрфіне” [2, с. 72]; *фалендышава* – галандскае сукно [3, с. 70]. “<...> А яна падышла бліжэй і проста ў футры, у фалендышавай сукні” <…> [2, с. 620].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Як відаць, У. Караткевіч творча рэалізуе прыёмы стылістычнага выкарыстання бытавой лексікі. З аднаго боку, бытавыя гістарызмы выступаюць як неабходны матэрыял гістарычнага апавядання, а з другога, – з'яўляюцца сродкам сацыяльнай характарыстыкі персанажаў. Гэта добра праглядаецца ў назвах адзення і абутку.

2. Назвы з'яў грамадска-палітычнага парадку, членаў царскай сям'і, прадстаўнікоў саслоўяў і г. д.:

пан – асоба, якая належыць да прывілегаваных слаёў грамадства."<…> А вы заставайцеся тут, пан Адам <…>" [2, с. 154]; *шляхта* – прывеліяванае саслоўе, дробнапаместае дваранства ў Польшчы, Літве, Беларусі ў XIII – пачатку XX ст. "<…> Дробная шляхта – гэта бочка з порахам <…>" [2, с. 78]; *паніч* – сан пана; малады пан. "<…> Андрэй ступіў да паніча і выняў са скуранога вацка шчопаць сажы, тлустай сажы з хатняй сцяны <…>" [2, с. 23]; *купец* – багаты гандляр, уладальнік прыватнага гандлёвага прадпрыемства. "<…> – У купцоў ператварыццаа..?" [2, с. 8]; *баяры* (гіст.) – радавіты дваранін, буйны памешчык; *гасудар* (гіст.) – глава манархічнай дзяржавы; цар, імператар; *дзедзіц* (гіст.) – 1. Наследнік дзедаўскага памесця, двара, маёнтка. 2. Уладар маёнтка, атрыманага ў спадчыну ад продкаў; землеўладарнік."<…> Ага, едзе дзездзіц Іван Таркайла <…>". [2, с. 97]; *каралевіч* – сын караля. "<...> Прыедзе каралевіч, дык яны яго яшчэ і ад злога бацькі ўратуюць <...>" [2, с. 162]; *сейм* - 1. Саслоўна-прадстаўнічы орган у феадальнай Польшчы, Літве, Чэхіі і некаторых іншых дзяржавах Усходняй Еўропы. 2. Назва вышэйшага органа дзяржаўнай улады ў Польскай Народнай Рэспубліцы. "<...> Падпойваць шляхту, гарлаць на сеймiках, глядзець, як потныя і ачмурэлыя людзі вырашаюць палітычныя пытанні бойкай і шалёна сякуцца на шаблях, ехаць на сейм <...>" [2, с. 170]; *сеймік* – сход шляхты павета або ваяводства ў Вялікім княстве Літоўскім. "<...> Падпойваць шляхту, гарлаць на сеймiках, глядзець, як потныя і ачмурэлыя людзі вырашаюць палітычныя пытанні бойкай і шалёна сякуцца на шаблях, ехаць на сейм <...> " [2, с. 170]

У мастацкіх творах на гістарычныя тэмы такія словы не толькі пазначаюць рэаліі, але і ствараюць пэўны каларыт эпохі. Устарэлыя словы могуць выкарыстоўвацца ў мастацкім тэксце для ўказання на час, у які адбываецца дзеянне.

3. Назвы пасад і асоб па роду іх заняткаў:

аканом – кіраўнік гаспадаракі ў панскім маёнтку. "<…> Сёння дакладаў не будзе ні ў вас, ні ў галоўнага аканома <...>" [2, с. 189]; *зрак* – чалавек, які даглядаў жывёл."<…> Вы, меленькія людцы, – здаецца, казаў зрак каня <…>" [2, с. 19]; *даязджачы* – даездчык, псар, які распараджаецца

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

хартамі на паляванні; *сакалятнік* – сакаліна паляўнічы, той, хто даглядаў лоўных птушак, навучаў іх для палявання. “<…> І пры гэтым выгляд меў аніяк не спешчанага прыдворнага, а хутчэй война і сакалятніка, небяспечна для кожный райскай птушкі, якую адзначыць сваім вокам <...>” [2, с. 109]; *ваявода* – на тэрыторыі Старажытнай Русі – начальнік войска, кіраўнік горада ці акругі. “<…> З гэтай хвіліны памятай, шабля – ваяводзе справядлівай вайны, жыццё – усім добрым людзям, сэрца – каханай <…>” [2, с. 54]; *лёкай* – лакей. “<…>З карэты другі лёкай дастаў маленькую і зграбную, як ляльку, дзяўчынку год дзевяці…” [2, с. 84]; *жаўнер* – салдат польскай арміі. “<...> Хай жаўнеры штыкамі снапы носяць <...>” [2, с. 123]; *мнішка* – манашка. “<...> Ля гаршка сядзіць на калодзе жанчына тая, што давала піць. Дзіўная жанчына. Уся ў чорным, як мнішка <...>” [2, с. 136]; *фурман* – чалавек, які кіруе конямі ў запрэжанай фурманцы; вазак. “<...> Мсціслаў сядзеў на месцы фурмана <...>”[2, с. 162]; *мніх* – устарэлы выраз Манах. “<...> Жыў цяпер ледзь не суровым мніхам <...>” [2, с. 172]; *рэкрут* – у дарэформеннай царскай Расіі – салдат-навабранец. “<...> Праскоўя Зубава папрасіла ў імператрыцы дазволу здаваць сваіх магілёўскіх сялян у рэкруты <...>” [2, с. 187]; *пушкар* – устарэлы выраз Артылерыст. “<...> Пан з закамянелым тварам загадваў пушкарам сыпаць падвойны парахавы зарад <...>” [2, с. 196]; *ландвойта* – намеснік войта, адзін з управляючых горадам [3, с. 302]. “<...> Ландвойта, што прыехаў сунімаць крык і агіднасць, закідалі расталым конскім гноем і наўздагон свісталі ў два пальцы і ўлюлюкалі <...>” [2, с. 71]; *найміт* – наёмны работнік, парабак [3, с. 370].“<…> – Найміт, – усміхнуўся ён. – Але ты добра біўся <...>” [2, с. 72].

Выкарыстанне ўстарэлай лексікі У Караткевічам выклікана не толькі тэматычнай абумоўленасцю, зместам, спецыфікай вобразаў, але і магчымасцю абраць найбольш ўдалы ў мастацкіх адносінах варыянт. Гэтая магчымасць выбару закладзена ў самой прыродзе ўстарэлых слоў, якія валодаюць пэўнай стылістычнай значнасцю.

Пры аналізе мастацкіх твораў У. Караткевіча выяўляецца значная колькасць устарэлых лексічных адзінак, якія ў сучаснай беларускай літаратурнай мове маюць паўнавартасныя эквіваленты, дакладныя сэнсавыя сінонімы. Гэта дае нам падставу разглядаць выкарыстаныя пісьменнікам ўстарэлыя словы як складаную мастацкую працу па гістарычнай стылізацыі [4], “у большай меры і ступені праявіўся мастацкі сінтэз беларускага вусна-гутарковага і кніжна-пісьмовага маўлення паводле ўзораў коласаўскага і чорнаўскага метаду, але са значнай колькасцю архаізмаў і гістарызмаў” [5, с. 231].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Спіс літаратуры

1. Мальдзіс, А. Жыццё і ўзнясенне У Караткевіча . – Мінск : Маст. літ., 1987., 1990. – 350 с.

2. Караткевіч, У. Збор твораў : у 8 т. / [аўт. прадм. В. Быкаў]. – Мінск : Маст. літ., 1987. – Т. 1 : Вершы, паэмы. – 431 с., 4 л. іл.

3. Караткевіч, У С. Каласы пад сярпом тваім / У. С. Караткевіч. – Мінск : Папуры, 2017. – 928 с.

4. Электронная бібліятэка БДПУ [Электронный ресурс] / Гістарычныя творы Уладзіміра Караткевіча як сродак патрыятычнага выхавання беларусаў. – рэжым доступу: elib.bspu.by. – Дата доступу: 1.04.2020.

5. Борбат, Т. І. Аб пісьменніцкай індывідуальнасці Ул. Караткевіча / Т. І. Борбат, І. М. Ячмяньова // Компаративні дослідження слов'янських мов і літератур : пам'яті академіка Леоніда Булаховського : Збірник наукових праць. – Випуск 34. – Київ : Освіта України, 2018. – С. 226–231.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова